# Палажэнне пра конкурсы праектных прапаноў ад праграмы Belarus Beehive 2.0:

*падтрымка грамадзянскай супольнасці як ключавога рухавіка дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі*

## Змест

**Уводзіны**
1.1. Кантэкст
1.2. Мэты конкурсу праектных прапаноў

Лот 1 Праектная падтрымка АГС
Лот 2. Падтрымка арганізацыйнага развіцця і інстытуцыйная падтрымка АГС
Лот 3. Падтрымка кааліцый АГС, сектаральных палітычных устаноў і сетак

1.3. Памер грантаў

1.4 Тэрміны конкурсаў і дэдлайны

1.5 Тэрміны бягучага адкрытага конкурсу

**2. Крытэрыі прымальнасці конкурсу прапаноў**

2.1 Крытэрыі прымальнасці
2.1.1. Крытэрыі прымальнасці да заяўнікаў
2.1.2. Крытэрыі прымальнасці да відаў дзейнасці (прыярытэты для лота 1 і віды дзейнасці для лотаў 2, 3)
2.1.3. Крытэрыі прымальнасці выдаткаў

**2.2 Колькасць заявак і грантаў на заяўніка**

**3. Бачнасць праекта**

**4. Этычныя палажэнні і Кодэкс паводзін**

**5. Працэс падачы заяўкі і працэдуры**
**5.1 Праектныя прапановы**
**5.2 Як адпраўляць праектныя прапановы**
**5.3 Адбор праектных прапаноў**
5.3.1. Крок 1: Адміністрацыйная праверка
5.3.2. Крок 2: Ацэнка праектнай прапановы
5.3.3. Крок 3: Пасяджэнне адборачнай камісіі
5.3.4. Крок 4: Праверка прымальнасці заяўнікаў
5.3.5. Крок 5: Падача дакументаў для папярэдне адабраных заявак
5.3.6. Крок 6: Паведамленне пра рашэнне

**6. Паслядоўнасць крокаў пасля прыняцця рашэння пра вылучэнне гранта**

**7. Спіс дадаткаў**

BELARUS BEEHIVE

# УВОДЗІНЫ

## 1.1. КАНТЭКСТ

Конкурс праектных прапаноў аб’яўляецца ў межах праграмы «Belarus Beehive 2.0: падтрымка грамадзянскай супольнасці як ключавога рухавіка дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі». Агульнай мэтай праграмы з’яўляецца *рэарганізацыя і ўзмацненне беларускай грамадзянскай супольнасці ва ўмовах турбулентнасці і палітычных змен.* Падача праектных прапаноў у конкурсе ажыццяўляецца праз вэб-аплікацыю.

## 1.2. МЭТЫ КОНКУРСУ ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

Асноўнай мэтай гэтага конкурсу праектных прапаноў з’яўляецца развіццё сталай грамадзянскай супольнасці як актара дэмакратычных змен Беларусі.
Гэта значыць – узмацненне тэхнічнага патэнцыялу і рэсурсаў арганізацый грамадзянскай супольнасці (далей – АГС) для спрыяння дэмакратычным зменам і дасягнення місій і мэт арганізацый.

***Конкурс праектных прапаноў падзелены на 3 лоты:***

## ЛОТ 1. ПРАЕКТНАЯ ПАДТРЫМКА АГС

Мэта лота 1: даць магчымасць беларускім АГС і грамадскім ініцыятывам працягваць аказваць паслугі сваім мэтавым групам або распрацоўваць і рэалізоўваць інавацыйныя праекты для адказу на сучасныя выклікі.

Далей у гэтым лоце плануецца перыядычнае абнаўленне прыярытэтаў для падтрымкі актуальных праектаў арганізацый грамадзянскай супольнасці. Прыярытэты могуць быць выпраўлены або зменены ў адпаведнасці з базавым даследаваннем, штогадовымі ацэнкамі патрэб, аналізам папярэдніх конкурсаў прапаноў, кансультацыямі з зацікаўленымі бакамі.

*Чаканыя вынікі для АГС у Беларусі:*

- павышэнне ўстойлівасці грамадзянскай супольнасці;
- захаванне існых і з’яўленне новых ініцыятыў і нефармальных груп;
- з’яўленне здольнасцяў працаваць з актуальнымі грамадскімі праблемамі, планаваць і рэалізоўваць змены і інавацыйныя рашэнні;
- захаванне сацыяльных/грамадзянскіх сувязяў паміж людзьмі ў краіне;

- працяг аказання паслуг для мэтавых аўдыторый (АГС па-ранейшаму здольныя аказваць свае паслугі мэтавым групам).

*Чаканыя вынікі для АГС у выгнанні:*

- поўнае ці частковае вырашэнне праблем і выклікаў, з якімі сутыкаюцца іх мэтавыя групы;
- адкрыццё новых ці паляпшэнне якасці паслуг, запатрабаваных вялікай колькасцю беларусаў у краіне і за яе межамі;
- аказанне дапамогі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі;
- змена стаўлення зацікаўленых бакоў да пэўных праблем праз адвакацыю, распрацоўку і прапанову стратэгій і палітык;
- павышэнне дасведчанасці мэтавых груп у грамадскіх і палітычных пытаннях, змена паводзін і адносін мэтавых груп на больш дэмакратычныя і канструктыўныя.

## ЛОТ 2. ПАДТРЫМКА АРГАНІЗАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ І ІНСТЫТУЦЫЙНАЯ ПАДТРЫМКА АГС

Мэта лота 2: даць магчымасць беларускім АГС быць устойлівымі і моцнымі агентамі перамен у/для Беларусі або/і надзейнымі партнёрамі для іншых зацікаўленых бакоў і донараў, падтрымліваючы і ўмацоўваючы тых, хто можа быць агентамі перамен у Беларусі.

Чаканыя вынікі ў Беларусі:

● павышэнне ўстойлівасці і жыццяздольнасці груп грамадзянскай супольнасці, захаванне іх сувязяў з АГС за мяжой.

● з'яўленне здольнасцяў працаваць з актуальнымі грамадскімі праблемамі, планаваць і рэалізоўваць змены і інавацыйныя рашэнні

Чаканыя вынікі для АГС у выгнанні:

● павышэнне ўстойлівасці АГС, пашырэнне грамадскай падтрымкі, захаванне сувязяў з мэтавымі групамі і групамі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі,

● з'яўленне здольнасцяў працаваць з актуальнымі грамадскімі праблемамі, планаваць і рэалізоўваць змены і інавацыйныя рашэнні;

● пашырэнне патэнцыялу для стварэння сетак, сектаральнага і міжсектаральнага супрацоўніцтва і стварэння кааліцый, дыверсіфікацыі фінансавых крыніц і росту колькасці сябраў;

● удасканаленне ўнутраных працэдур, павышэнне кваліфікацыі персаналу, павышэнне пазнавальнасці арганізацыі, пашырэнне кола валанцёраў і спажыўцоў іх паслуг.

## ЛОТ 3. ПАДТРЫМКА КААЛІЦЫЙ АГС, СЕКТАРАЛЬНЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ УСТАНОЎ І СЕТАК

Мэта лота 3: умацаванне кааліцый АГС, сетак і галіновых палітычных інстытутаў, у прыватнасці, беларускіх імплементараў міжнароднай дапамогі. А таксама дапамога ім у рэалізацыі іх планаў развіцця і адвакацыі.
Чаканыя вынікі:

● бачнае супрацоўніцтва і супольныя дзеянні, устойлівасць і прызнанне ад зацікаўленых бакоў і мэтавых груп, змяненне стаўлення зацікаўленых бакоў да пэўных праблем праз адвакацыю, прапанаваныя стратэгіі і палітыкі;
● умацаванне грамадскай падтрымкі, то-бок прызнанне іх ролі з боку стэйкхолдараў, мэтавых груп і чальцоў кааліцый;
● падтрымка сувязі з групамі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі;
● здольнасць планаваць і ажыццяўляць грамадскія змены, быць заканадаўцамі трэндаў для іх тэматычнага сектара і дэманстраваць мадэлі і найлепшыя практыкі для пераймання дэмакратычнай арганізацыйнай культуры;
● дастатковы патэнцыял для аказання аператыўнай падтрымкі іншым удзельнікам грамадзянскай супольнасці, добра развітыя ўнутраныя працэдуры.

## 1.3. ПАМЕР ГРАНТАЎ

Бюджэт праектнай прапановы ў межах гэтага конкурсу прапаноў павінен быць паміж наступнымі мінімальнымі і максімальнымі сумамі:

**Лот 1**
Максімальная сума, якая вылучаецца на грант: 60 000 еўра.
Мінімальны памер гранта: 5000 еўра.
Сярэдні чаканы памер гранта: 40 000 еўра.

**Лот 2**
Максімальная сума, якая вылучаецца на грант: 40 000 еўра.
Мінімальны памер гранта: 5000 еўра.
Сярэдні чаканы памер гранта: 30 000 еўра.

**Лот 3**
Максімальная сума, якая вылучаецца на грант: 60 000 еўра.
Мінімальны памер гранта: 5000 еўра.
Сярэдні чаканы памер гранта: 54 000 еўра.

Памер гранта ва ўсіх лотах пакрывае ўсе 100 % выдаткаў праекта.

## 1.4. ТЭРМІНЫ КОНКУРСАЎ І ДЭДЛАЙНЫ

**ЛОТ 1**

1 траўня 2024 г.
08 верасня 2024 г.
31 снежня 2025 г.
14 лютага 2025 г.
24 красавіка 2025 г.

**ЛОТ 2**

1 траўня  2024 г.
08 верасня 2024 г.
14 лютага 2025 г.

**ЛОТ 3**

1 траўня 2024 г.
08 верасня 2024 г.
14 лютага 2025 г.

*Для ўсіх лотаў праектныя прапановы прымаюцца да 23.59 (час паводле Мінска, Беларусь – UTC/GMT +3:00) у адпаведнасці з правіламі, выкладзенымі ў гэтым Палажэнні.*

## 2. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ КОНКУРСУ ПРАПАНОЎ

Гэтыя кіраўнічыя прынцыпы вызначаюць правілы падачы, адбору і рэалізацыі праектаў, якія фінансуюцца ў рамках гэтага конкурсу прапаноў. Гэтыя правілы сфармуляваны ў адпаведнасці з умовамі пагаднення аб гранце для праграмы Belarus Beehive.

## 2.1. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ

Ёсць тры наборы крытэрыяў прымальнасці, звязаных з:

(1) заяўнікам, г. зн. юрыдычнай або фізічнай асобай, якая падае форму заяўкі;
(2) відам дзейнасці, на які можа быць вылучаны грант;
(3) формамі фінансавання і відамі выдаткаў, якія могуць быць улічаны пры вызначэнні памеру гранта.

### 2.1.1. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ ДА ЗАЯЎНІКАЎ

*Каб мець права на атрыманне гранта, заяўнік павінен:*

**Для лота 1 і лота 2:**

а) быць арганізацыяй грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, нефармальнымі групамі без статусу юрыдычнай асобы, прадстаўленымі фізічнымі асобамі ў Беларусі ці за мяжой, якія дзейнічаюць пад назвай арганізацыі/ініцыятывы грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, або беларускімі няўрадавымі арганізацыямі, зарэгістраванымі за межамі Беларусі (краіны ЕС, Усходняга партнёрства або Еўрапейскай эканамічнай зоны).

б) Быць беларускай арганізацыяй грамадзянскай супольнасці, зарэгістраванай за межамі Беларусі, у адной з краін ЕС (як Літва, Польшча), Усходняга партнёрства (як Грузія), або Еўрапейскай эканамічнай зоны.

Беларускія арганізацыі (ініцыятывы) грамадзянскай супольнасці, якія дзейнічаюць у Беларусі, павінны рэалізоўваць праект або ў партнёрстве з асноўным заяўнікам, зарэгістраваным у адной з вышэйзгаданых краін, або як прыватныя асобы, або паводле кантрактаў на аснове вынікаў (Output Based Contracts). Магчымасць рэалізацыі праекта паводле такога кантракта будзе вызначацца ў кожным канкрэтным выпадку.

**Для лота 3:**

а) Быць кааліцыяй грамадзянскай супольнасці, установай сектаральнай палітыкі ці сеткай, **якая сістэматычна працуе з сектаральнай палітыкай, мае мэты ў гэтай галіне, лабіруе і арганізоўвае вакол такіх пытанняў іншых удзельнікаў, каардынуе развіццё дарожных карт або планаў дзеянняў паміж сабой і з донарамі**. У прыватнасці, мы шукаем заяўнікаў, якія пачалі або плануюць запусціць кампанент фінансавай дапамогі трэцім асобам у пэўнай тэматычнай

вобласці, а таксама тых, хто пачынае заключаць Output Based Contracts (кантракты на аснове вынікаў) для сваіх бенефіцыяраў.

Заяўнікі, сузаяўнікі і, у выпадку юрыдычных асоб, асобы, якія маюць правы прадстаўніцтва, прыняцця рашэнняў або кантролю за юрыдычнымі асобамі, апавяшчаюцца, што калі яны знаходзяцца ў адной з сітуацый выключэння згодна з крытэрыямі выключэння, іх асабістыя даныя (імя, прозвішча, калі гэта фізічная асоба, адрас, прававая форма і імя, прозвішча асоб, якія маюць правы прадстаўніцтва, прыняцця рашэнняў або кантролю, калі гэта юрыдычная асоба) могуць быць зарэгістраваны ў сістэме ранняга выяўлення і выключэння Еўрапейскай камісіі або ў спісе санкцый і паведамлены асобам і арганізацыям, звязаным з прысуджэннем або выкананнем грантавага кантракта.

У Дэкларацыі заяўніка *(Declaration by the applicant)* уключанай у форму заяўкі на грант (Дадатак А), заяўнік павінен заявіць, што ён не знаходзіцца ні ў адной з гэтых сітуацый. Калі заяўніку прысуджаны грантавы кантракт, ён становіцца атрымальнікам рэ-гранта (грантаатрымальнікам).

Заяўнік можа дзейнічаць асобна або з партнёрамі.

У выпадку заключэння кантракта на грант галоўны заяўнік стане галоўным каардынатарам гранта. Ён дзейнічае ад імя сваёй арганізацыі і сузаяўніка (партнёра), калі такі маецца, і поўнасцю каардынуе рэалізацыю праекта;

Сузаяўнікі (партнёры) удзельнічаюць у распрацоўцы і рэалізацыі праекта, і выдаткі, якія яны нясуць, прымаюцца гэтак жа, як і выдаткі, панесеныя вядучым заяўнікам;

Сузаяўнікі павінны адпавядаць патрабаванням, якія прымяняюцца да самога вядучага заяўніка;

Сузаяўнікі павінны падпісаць Мандат сузаяўніка (Дадатак В);

У выпадку заключэння кантракта на грант сузаяўнік(-і) стане атрымальнікам(-і) праекта (разам з каардынатарам).

## 2.1.2. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ ДА ВІДАЎ ДЗЕЙНАСЦІ (ПРЫЯРЫТЭТЫ ДЛЯ ЛОТА 1 І ВІДЫ ДЗЕЙНАСЦІ ДЛЯ ЛОТАЎ 2, 3)

Праект складаецца з шэрагу ўзгодненых дзеянняў, накіраваных на дасягненне запланаваных вынікаў і мэт.

**Сектары ці тэмы, да якіх павінны адносіцца праекты:**

Тэматычныя прыярытэты **лота 1** (для праектаў, якія пачынаюцца ў 2024 годзе):
*Прыярытэт 1.* Грамадзянская актыўнасць у Беларусі.

*Прыярытэт 2.* Садзейнічанне новым грамадскім дыскурсам і культурным наратывам у беларускім грамадстве і за яго межамі.
*Прыярытэт 3.* Падтрымка тэматычных сектаральных праектаў, вызначаных як найбольш перспектыўныя і развіццёвыя для беларускага грамадства.
*Прыярытэт 4.* Далейшае развіццё кантэнту па грамадзянскай адукацыі для анлайн-навучання на платформе Belarus Beehive.

Набор прыярытэтаў можа быць зменены або пашыраны ў наступных этапах конкурсу на падставе штогадовых кансультацый, якія праводзіліся для Ацэнкі патрэб Беларусі ў знешняй дапамозе ў супрацоўніцтве з донарам.

Праекты ў рамках лотаў 2 і 3 (арганізацыйнае развіццё) могуць быць пададзены арганізацыямі любога тэматычнага сектара. Аднак прыярытэтам для падтрымкі інстытуцыйнага і арганізацыйнага развіцця *будуць арганізацыі, якія з'яўляюцца «цэнтрамі прыцягнення» для беларускага грамадства і аказваюць вельмі запатрабаваныя паслугі.*

## Месцазнаходжанне

Дзеянні павінны адбывацца ў Беларусі, а таксама ў еўрапейскіх краінах (ЕС, Усходняга партнёрства, ЕЭЗ), дзе заснаваны арганізацыі грамадзянскай супольнасці, створаныя беларусамі на эміграцыі.

## Віды актыўнасцяў, якія могуць фінансавацца

**Прыярытэты для лота 1**: падтрымліваюцца праекты, якія дазваляюць грамадскім арганізацыям і ініцыятывам на базе супольнасці аказваць паслугі сваім мэтавым групам, павялічваць уплыў дзеянняў або запускаць інавацыйныя ідэі.

**Прыярытэт 1. Грамадзянская актыўнасць у Беларусі**.

*Магчымыя віды дзейнасці:*

- падтрымка дэмакратыі, абарона правоў чалавека і грамадзянскіх свабод;
- прадухіленне агрэсіі на мясцовым, нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, а таксама прадухіленне таталітарных і імперыялістычных практык;
- адукацыйныя, культурныя, даследчыцкія, гендарныя і экалагічныя актыўнасці на мясцовым і нацыянальным узроўнях;
- павышэнне эканамічнай стабільнасці і фінансавай пісьменнасці на мясцовым узроўні;
- кансультаванне, навучанне, настаўніцтва паводле прынцыпу «роўны – роўнаму»;
- падтрымка пацярпелых (напрыклад, пацярпелых ад гвалту, дыскрымінацыі, вайны і г. д.);

- надзвычайная псіхалагічная дапамога ў крызісных сітуацыях;
- стварэнне IT-прадуктаў, напісанне і рэдагаванне кніг, іншага кантэнту для далейшага выдання;
- перадача і маштабаванне найлепшых практык;
- правядзенне спартыўных і забаўляльных мерапрыемстваў для супольнасцяў;
- паездкі, калі гэта неабходна для дзейнасці, удзел у мерапрыемствах і працоўных сустрэчах за мяжой, фінансавыя і адміністрацыйныя выдаткі.

**Прыярытэт 2. Садзейнічанне новым грамадскім дыскурсам і культурным наратывам у беларускім грамадстве і за яго межамі.**

*Магчымыя віды дзейнасці:*

- Інфармацыйныя, культурныя, адукацыйныя або камбінаваныя дзейнасці, якія дазваляюць насельніцтву выйсці з уплыву агенды «рускага свету», «постсавецкай прасторы», віктымізацыі і г. д.;
- Развіццё і распаўсюджванне інавацыйных тэхналагічных інструментаў, якія дазваляюць АГС быць больш эфектыўнымі і абароненымі;
- Дзейнасць, накіраваная на пераадоленне меж паміж беларускім грамадствам унутры і звонку краіны;
- Мерапрыемствы для вырашэння праблем у фармаце мазгавога штурму, міжсектаральныя мерапрыемствы;
- Інфармацыйныя або адвакацыйныя кампаніі;
- Перадача і маштабаванне найлепшых практык.

**Прыярытэт 3. Падтрымка тэматычных сектаральных праектаў, вызначаных як найбольш перспектыўныя і развіццёвыя для беларускага грамадства.**

*Магчымыя віды дзейнасці:*

- Дзейнасць для павышэння ўсведамлення, адукацыі, аховы навакольнага асяроддзя, культуры, бізнесу, правоў чалавека, зялёнай эканомікі, супраціву гвалту, сацыяльных і працоўных пытанняў і іншых сектараў, якія ўкараняюць інавацыйныя падыходы, распаўсюджваюць добрыя практыкі, забяспечваюць аказанне паслуг у гэтых сферах на мясцовым узроўні ў Беларусі і трансгранічна;
- Падтрымка развіцця сектаральных і міжсектаральных парадкаў дзеянняў, стратэгій і праграм для супольных дзеянняў у гэтых сектарах;
- Падтрымка жыцця мясцовых супольнасцяў у Беларусі.

**Прыярытэт 4. Далейшае развіццё анлайн-навучальнага кантэнту.**

*Магчымыя віды дзейнасці:*

- Развіццё і вытворчасць матэрыялаў для павышэння кваліфікацыі і навучальных матэрыялаў, а таксама самастойных анлайн-курсаў.

**Віды дзейнасці, якія могуць фінансавацца ў лоце 2.**
**Падтрымка арганізацыйнага развіцця і інстытуцыйная падтрымка АГС:**

- умацаванне арганізацыйных змен (распрацоўка і ўмацаванне працэдур унутранай палітыкі, сувязі з грамадскасцю, пабудова партнёрства, бяспека і іншыя змены, вызначаныя ў арганізацыйнай ацэнцы і плане арганізацыйнага развіцця);
- распрацоўка сродкаў камунікацыі (уключаючы карпаратыўныя вэб-сайты і акаўнты ў сацыяльных сетках);
- меры па павышэнні кваліфікацыі і эфектыўнасці супрацоўнікаў, валанцёраў і сябраў; меры па наборы новых сябраў або валанцёраў;
- суправаджэнне арганізацыйных сустрэч, стратэгічных сесій, ментарства;
- стажыроўкі, навучанне для паляпшэння функцыянавання арганізацыі, яе аператыўнага патэнцыялу, прадухіленне і вырашэнне канфліктаў;
- асноўнае забеспячэнне: набыццё абсталявання, арэнда памяшканняў; падтрымка асноўнага складу супрацоўнікаў асобных падраздзяленняў (аддзелаў); арганізацыйныя аўдыты.

**Віды дзейнасці, якія могуць фінансавацца ў лоце 3. Падтрымка кааліцый АГС, устаноў сектаральнай палітыкі і сетак, магчымыя віды дзейнасці:**

- умацаванне арганізацыйных змен (распрацоўка і ўмацаванне працэдур, унутраная палітыка, сувязі з грамадскасцю, пабудова партнёрства, бяспека і іншыя змены, вызначаныя ў арганізацыйнай ацэнцы і плане арганізацыйнага развіцця);
- даследаванні мэтавых груп і іх патрэб;
- распрацоўка сродкаў камунікацыі (уключаючы карпаратыўныя вэб-сайты і акаўнты ў сацыяльных сетках);
- вызначэнне і адвакацыя тэматычных або сектаральных патрэб, прасоўванне мэсіджаў і нарматываў;
- меры па павышэнні кваліфікацыі і эфектыўнасці працы супрацоўнікаў і чальцоў рады кааліцыі; дзейнасць па прыцягненні новых сябраў і прыхільнікаў;
- падтрымка пасяджэнняў персаналу і праўлення, стратэгічных сесій;
- стажыроўкі, навучанне і навучанне на працоўным месцы для паляпшэння функцыянавання арганізацыі, яе аператыўнага патэнцыялу, прадухілення і вырашэння канфліктаў;
- асноўнае забеспячэнне: набыццё абсталявання, арэнда памяшканняў; падтрымка асноўнага складу супрацоўнікаў і асобных аддзелаў пры неабходнасці.

## Працягласць

Мінімальная працягласць праектаў у лоце 1 складае 2 месяцы, максімальная – 12 месяцаў. Большы тэрмін рэалізацыі можа быць разгледжаны ў выпадку добра абгрунтаваных прапаноў.

Мінімальная працягласць праектаў у лотах 2 і 3 складае 3 месяцы, максімальная – 12 месяцаў.

Праекты пачынаюцца з даты, указанай у кантракце. Не дапускаецца фінансаванне дзейнасці, якая была рэалізавана да афіцыйнага старту праекта.

## 2.1.3. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ ВЫДАТКАЎ

Грантавая падтрымка ажыццяўляецца ў форме кампенсацыі выдаткаў.

Грант можа пакрыць толькі прымальныя выдаткі. Ніжэй пазначаны катэгорыі прымальных і непрымальных выдаткаў.

**Магчымыя прамыя выдаткі**

Каб атрымаць грант у гэтым конкурсе прапаноў, выдаткі павінны адпавядаць палажэнням кантракта аб гранце.

Заяўнікі згаджаюцца з тым, што праверка(-і) выдаткаў, згаданая(-ыя) у кантракце аб гранце, будзе праводзіцца аўдытарам, якога наймае галоўны бенефіцыяр.

**Магчымыя ўскосныя выдаткі**

Ускосныя выдаткі, панесеныя пры рэалізацыі праекта, могуць адпавядаць патрабаванням фінансавання паводле фіксаванай стаўкі, але агульная сума не павінна перавышаць 7 % разлікоўвай агульнай сумы прымальных прамых выдаткаў. Ускосныя выдаткі з’яўляюцца прымальнымі пры ўмове, што яны не ўключаюць у сябе выдаткі, аднесеныя да іншай катэгорыі бюджэту ў кантракце аб гранце. Заяўніка могуць папрасіць абгрунтаваць запытаны працэнт перад падпісаннем кантракта аб гранце. Аднак пасля ўстанаўлення фіксаванай стаўкі ніякіх пацвярджальных дакументаў падаваць ужо не трэба.

**Натуральныя ўклады**

Натуральныя і ўклады – гэта бясплатнае даванне атрымальнікам гранту тавараў або паслуг трэцяй асобай. Паколькі натуральныя ўнёскі не прадугледжваюць ніякіх выдаткаў для атрымальнікаў гранту, яны не з’яўляюцца прымальнымі выдаткамі і не могуць быць уключаны ў бюджэт.

**Недапушчальныя выдаткі**

Наступныя выдаткі не могуць быць падтрыманы:

- даўгі і плацяжы па абслугоўванні доўгу (працэнты);
- рэзервы на пакрыццё страт або магчымых будучых абавязкаў;
- заяўленыя выдаткі, якія фінансуюцца іншымі праграмамі ЕС;
- купля зямлі або будынкаў;
- страты пры абмене валют;
- пошліны, падаткі і зборы, уключаючы VAT, за выключэннем выпадкаў, калі яны не кампенсуюцца ў адпаведнасці з нацыянальным падатковым заканадаўствам;
- крэдыты трэцім асобам;
- штрафы, пені і судовыя выдаткі, звязаныя з жыццядзейнасцю менавіта арганізацыі;
- натуральныя ўклады.

Пры пэўных абставінах у кожным канкрэтным выпадку могуць разглядацца **спрошчаныя варыянты аплаты**. Важна адзначыць, што гэтыя выпадкі будуць асобна разглядацца і ўзгадняцца з донарам. Ацэначная камісія можа запатрабаваць ад заяўніка перагледзець праектную прапанову ў адпаведнасці з канкрэтнымі рэкамендацыямі, дадзенымі атрымальніку гранта пасля ацэнкі.

## 2.2. КОЛЬКАСЦЬ ЗАЯВАК І ГРАНТАЎ НА АДНАГО ЗАЯЎНІКА:

● Заяўнік можа падаць больш за 1 заяўку ў рамках гэтага конкурсу прапаноў;
● Заяўнік можа атрымаць больш за 1 грант у рамках гэтага конкурсу прапаноў толькі ў тым выпадку, калі гэтыя гранты ўваходзяць у розныя лоты;
● Заяўнік можа быць сузаяўнікам у іншай заяўцы адначасова;
● Сузаяўнік не можа быць сузаяўнікам больш чым у 2 заяўках у рамках гэтага конкурсу прапаноў;
● Сузаяўніку можа быць прысуджана больш за 2 субгранты ў рамках гэтага конкурсу прапаноў толькі ў тым выпадку, калі гэтыя субгранты ўваходзяць у розныя лоты;
● Пасля паспяховай рэалізацыі праекта і справаздачнасці заяўнік можа падаць заяўку на наступныя конкурсы ў рамках таго ж або іншага лота.

## 3. БАЧНАСЦЬ ПРАЕКТА

Падчас рэалізацыі праекта і на ўсіх прадуктах, калі гэта не аказвае негатыўнага ўплыву на дзейнасць заяўніка, павінна быць згадана падтрымка ад Belarus Beehive.

## 4. ЭТЫЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ І КОДЭКС ПАВОДЗІН

**а) Адсутнасць канфлікту інтарэсаў.**

Заяўнікі не павінны мецъ канфлікту інтарэсаў і не павінны мець эквівалентныя адносіны ў гэтым плане з іншымі заяўнікамі або бакамі, якія ўдзельнічаюць у праекце. Любая спроба заяўніка атрымаць канфідэнцыйную інфармацыю, заключыць незаконныя пагадненні з канкурэнтамі або паўплываць на ацэначную камісію або бенефіцыяра праекта ў працэсе разгляду, удакладнення, ацэнкі і параўнання заявак прывядзе да адхілення заяўкі і можа прывесці да адміністрацыйнай адказнасці і штрафных санкцый.

**б) Павага да правоў чалавека, а таксама прыродаахоўнага заканадаўства і асноўных працоўных стандартаў.**

Заяўнікі і супрацоўнікі павінны паважаць правы чалавека. У прыватнасці, у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам краіны знаходжання заяўнікі, якія заключылі кантракт, павінны прытрымлівацца прыродаахоўнага заканадаўства, уключаючы шматбаковыя экалагічныя пагадненні, а таксама асноўныя працоўныя стандарты, якія прымяняюцца і вызначаны ў адпаведных канвенцыях Міжнароднай арганізацыі працы (такіх як Канвенцыі аб свабодзе аб’яднанняў і калектыўных перамоў, ліквідацыі прымусовай і абавязковай працы, ліквідацыі дзіцячай працы).

**Нулявая цярпімасць да сексуальнай эксплуатацыі і сексуальнага гвалту:**

Belarus Beehive прымяняе **палітыку нулявой цярпімасці** да ўсіх супрацьпраўных дзеянняў, якія ўплываюць на прафесійны аўтарытэт заяўнікаў. Фізічны гвалт ці пакаранне або пагрозы фізічнага гвалту, сексуальнага гвалту ці эксплуатацыі, пераслед і слоўныя абразы, а таксама іншыя формы запалохвання забараняюцца.

**в) Барацьба з карупцыяй і хабарніцтвам.**

Кандыдаты павінны выконваць усе дзейныя законы, правілы і кодэксы, якія тычацца барацьбы з хабарніцтвам і карупцыяй. Асноўны бенефіцыяр дзеянняў і Еўрапейская камісія пакідаюць за сабой права прыпыніць або адмяніць фінансаванне праекта, калі карупцыйныя практыкі любога роду будуць выяўлены на любой стадыі працэсу прысваення гранта або падчас выканання кантракта аб паўторным гранце. У кантэксце гэтага палажэння «карупцыйныя дзеянні» – гэта прапанова хабару, падарунка, узнагароды або камісіі любой асобе ў якасці заахвочвання або ўзнагароджання за выкананне або ўстрыманне ад любога дзеяння, звязанага з заключэннем кантракта або выкананнем ужо заключанага кантракта.

**г) Парушэнне абавязацельстваў або махлярства.**

Бенефіцыяр асноўнага дзеяння і донар пакідаюць за сабой права прыпыніць або адмяніць працэдуру выдачы гранта, калі ёсць доказы, што яна была прадметам парушэння абавязацельстваў або махлярства. Калі гэта выяўляецца пасля заключэння кантракта, бенефіцыяр праекта можа ўстрымацца ад заключэння кантракта.

**д) Палітыка інфармавання пра парушэнні.**

Пра любыя падазрэнні ў махлярстве або карупцыі можна паведаміць у штаб-кватэру ў Брусэлі на адрас: pascal.willaumez@eap-csf.eu.

# 5. ПРАЦЭС ПАДАЧЫ ЗАЯЎКІ І ПРАЦЭДУРЫ

## 5.1. ПРАЕКТНЫЯ ПРАПАНОВЫ

Праектныя прапановы павінны быць дасланы праз вэб-аплікацыю (гл. раздзел 5.2.), з запоўненымі ўсімі дадаткамі (Дадаткі A, B, C). Прапановы павінны строга прытрымлівацца фармату, абзацы і старонкі павінны быць запоўнены па парадку. Заяўнікі могуць падаваць заяўкі на беларускай, рускай або англійскай мовах.

Калі ласка, запаўняйце поўную форму праектнай прапановы ўважліва і як мага дакладней, каб яе можна было правільна ацаніць. Любая памылка, звязаная з пунктамі, пералічанымі ў кантрольным спісе формы прапановы, або любыя істотныя неадпаведнасці могуць прывесці да адмовы ў фінансаванні.

Заяўкі, напісаныя ад рукі, не прымаюцца.

Звярніце ўвагу, што толькі форма праектнай прапановы (з Дэкларацыяй заяўніка і Мандатамі сузаяўнікаў, калі такія маюцца) і дадаткі, якія неабходна запоўніць (бюджэт, справаздача аб ацэнцы арганізацыйнага патэнцыялу для прапаноў да лотаў 2 і 3), будуць перададзены на ацэнку. Таму вельмі важна, каб гэтыя дакументы ўтрымлівалі ЎСЮ рэлевантную інфармацыю.

Ніякіх дадатковых дадаткаў дасылаць не трэба.

## 5.2. КУДЫ І ЯК АДПРАЎЛЯЦЬ ПРАЕКТНЫЯ ПРАПАНОВЫ

5.2.1. Падача праектных прапаноў у нашым конкурсе ажыццяўляецца праз спецыялізаваную вэб-аплікацыю. Спачатку пераканайцеся, што ў вас ёсць актыўная паштовая скрыня на сэрвісе Gmail (Google-акаўнт). Гэта неабходна для рэгістрацыі ў сістэме. Калі ласка, праверце, што доступ да вашай паштовай скрынкі абаронены надзейным паролем і ўключана двухфактарная аўтэнтыфікацыя, каб забяспечыць максімальную бяспеку вашых даных.

**Калі вы запаўняеце праектную прапанову з Беларусі, то карыстайцеся VPN.**

5.2.2. Для рэгістрацыі ў вэб-аплікацыі вашага электроннага адраса (Google-акаўнт) вам неабходна перайсці па спасылцы https://forms.gle/W9RmMqrvUNmLKeP76.

**Калі вы запаўняеце праектную прапанову з Беларусі, то карыстайцеся VPN.**

Прайшоўшы рэгістрацыю, вы на працягу аднаго працоўнага дня атрымаеце доступ да вэб-аплікацыі – вам будзе дасланы ліст на пазначаны адрас.

5.2.3. Перад тым, як прыступіць да запаўнення заяўкі, настойліва рэкамендуем вам уважліва азнаёміцца з умовамі конкурсу. Акрамя запоўненай праектнай прапановы, важна таксама запоўніць і падпісаць усе дадаткі, якія з'яўляюцца абавязковымі. Усе неабходныя формы вы зможаце знайсці ў вэб-аплікацыі.

5.2.4. Пасля таго, як вы запоўніце форму праектнай прапановы і далучыце ўсе неабходныя дадаткі, у вас будзе магчымасць захаваць яе і ўважліва перачытаць перад канчатковай адпраўкай. Гэта дае вам магчымасць пераканацца, што ўсе даныя адлюстраваны карэктна і поўна. Калі вы захочаце ўнесці яшчэ нейкія змены, вы можаце зрабіць гэта ў любы момант да моманту, калі вы націсніце кнопку «АДПРАВІЦЬ». Пасля націскання гэтай кнопкі вашая заяўка будзе афіцыйна зарэгістравана, вы ўбачыце паведамленне на экране і на ваш электронны адрас прыйдзе паведамленне пра яе прыём.

5.2.5. Пасля адпраўкі ваша заяўка будзе ўважліва разгледжана ў адпаведнасці з устаноўленымі ў раздзеле 5.3.6 тэрмінамі, пазначанымі ва ўмовах конкурсу. Вам будзе накіравана інфармацыя пра вынікі разгляду на пазначаны электронны адрас. Мы настойліва рэкамендуем вам рэгулярна, не радзей за два разы на тыдзень, правяраць сваю пошту на прадмет магчымых дадатковых пытанняў ад арганізатараў конкурсу.

5.2.6. Калі ў вас узнікнуць дадатковыя пытанні наконт працэсу падачы заяўкі ці ўмоў конкурсу, вы можаце звяртацца да нас з пытаннямі. Мы стварылі спецыяльную Google-форму для вашых пытанняў, якую можна запоўніць, перайшоўшы па гэтай спасылцы https://forms.gle/3ibvuKX3pta1tWmb8. Мы будзем адказваць на вашыя пытанні на працягу двух працоўных дзён і будзем працаваць над тым, каб забяспечыць усю неабходную падтрымку для паспяховага ўдзелу ў конкурсе.

## 5.3. АДБОР ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

Заяўкі будуць разглядацца Адборачнай камісіяй праекта Belarus Beehive пры магчымай дапамозе знешніх ацэншчыкаў.

Калі разгляд заяўкі выяўляе, што прапанаванае дзеянне не адпавядае крытэрыям прымальнасці, указаным у раздзеле 2.1, заяўка будзе адхілена толькі на гэтай падставе.

Адбор праектных прапаноў складаецца з наступных крокаў:

1. Адміністрацыйная праверка;
2. Ацэнка праектнай прапановы;
3. Пасяджэнне Адборачнай камісіі;
4. Праверка прымальнасці заяўнікаў;

5. Падача дакументаў для папярэдне адабраных заявак;
6. Паведамленне пра рашэнне.

*Ніжэй падрабязна можаце азнаёміцца з дэталямі кожнага кроку.*

## 5.3.1. КРОК 1: АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ ПРАВЕРКА

Пры адміністрацыйнай праверцы будуць ацэньвацца:

• Ці быў выкананы тэрмін падачы праектнай прапановы. Калі не, то прапанова будзе аўтаматычна адхілена.
• Ці адпавядае праектная прапанова ўсім крытэрыям, указаным у гэтым Палажэнні. Гэта ўключае таксама ацэнку прымальнасці праекта. Калі якая-небудзь запытаная інфармацыя адсутнічае або з'яўляецца няправільнай, заяўка можа быць адхілена толькі на гэтай падставе.
• Прымальнасць заяўнікаў будзе правярацца ў адпаведнасці з крытэрыямі, выкладзенымі ў раздзеле 2.1.

## 5.3.2. КРОК 2: АЦЭНКА ПРАЕКТНАЙ ПРАПАНОВЫ

Праектныя прапановы, якія прайшлі адміністрацыйную праверку, будуць дадаткова ацэньвацца паводле іх якасці, уключаючы прапанаваны бюджэт і магчымасці заяўнікаў.

**Лот 1:** Заяўкі будуць ацэньвацца ў спецыяльнай табліцы мінімум двума экспертамі незалежна адзін ад аднаго (выбіраюцца на конкурснай аснове, але з улікам аспектаў бяспекі). Ацэншчыкі выкажуць сваё меркаванне, запоўняць табліцу балаў (ацэначную сетку), выставяць балы і пакінуць каментарыі, уключаючы канчатковую рэкамендацыю для Адборачнай камісіі.

**Лот 2 і 3:** Заяўкі будуць ацэньвацца ў спецыяльнай табліцы чальцамі Адборачнай камісіі на падставе праектнай прапановы, ацэнкі арганізацыйных здольнасцяў і арганізацыйнага развіцця. Супрацоўнікі праекта і знешнія эксперты (абраныя на конкурснай аснове, але з улікам аспектаў бяспекі) выкажуць сваё меркаванне праз запаўненне табліцы (ацэначнай сеткі), выстаўленне балаў і пакіданне каментарыяў, уключаючы канчатковую рэкамендацыю для Адборачнай камісіі.

***Тэрмін ацэнкі праектнай прапановы не павінен перавышаць 1 месяц.***

Праектныя прапановы будуць ацэньвацца з выкарыстаннем крытэрыяў ацэнкі ў ацэначнай табліцы, дадзенай ніжэй. Ёсць два тыпы крытэрыяў ацэнкі: крытэрыі адбору і крытэрыі ўзнагароджання.

**Крытэрыі адбору** дапамагаюць ацаніць аперацыйныя магчымасці заяўнікаў і фінансавыя магчымасці вядучага заяўніка і выкарыстоўваюцца для праверкі наступных аспектаў:

• ці валодаюць заяўнікі кіраўнічым патэнцыялам, прафесійнымі кампетэнцыямі і кваліфікацыяй, неабходнымі для паспяховага завяршэння прапанаванага праекта. Кандыдаты павінны мець сістэму фінансавага менеджменту для забеспячэння належнай справаздачнасці і кантролю або быць гатовымі прайсці навучанне па фінансавым кіраванні і даць неабходную пацвярджальную дакументацыю;

• ці валодае арганізацыя вопытам, неабходным для рэалізацыі праекта;

• ці адпавядае арганізацыя патрабаванням незалежнай/няўрадавай арганізацыі.

**Крытэрыі ўзнагароджання** дапамагаюць ацаніць якасць заявак у сувязі з мэтамі, выкладзенымі ў гэтым Палажэнні, і вылучыць гранты на праекты, якія максімальна павялічваюць агульную эфектыўнасць конкурсу прапаноў. Крытэрыі ўзнагароджання ахопліваюць адпаведнасць праекта (ці адпавядае прапанова мэтам праграмы Belarus Beehive, ці абгрунтавана неабходнасць праекта), яго адпаведнасць мэтам конкурсу праектных прапаноў, якасць, чаканы эфект, устойлівасць і эканамічную эфектыўнасць (ці з'яўляюцца запланаваныя дзеянні, графік і бюджэт добра прадуманымі, разумнымі і адпаведнымі чаканым вынікам).

Ацэначная сетка падзелена на раздзелы і падраздзелы. Кожнаму падраздзелу будзе дадзена адзнака ад 1 да 5 балаў наступным чынам: 1 = вельмі дрэнна; 2 = дрэнна; 3 = адэкватна; 4 = добра; 5 = вельмі добра.

## Ацэначная сетка для лота 1

### 1. Раздзел «Рэлевантнасць праекта» (2, 3.1–3.5 у форме заяўкі). Максімальны бал – 15.

1.1 Наколькі адпавядае праектная прапанова мэтам конкурсу прапаноў і лота? Ці адпавядаюць чаканыя вынікі прыярытэтам, вызначаным у рэкамендацыях для заяўнікаў? Максімальны бал – 5.
1.2 Наколькі адпавядае праектная прапанова канкрэтным патрэбам і праблемам бенефіцыяраў і зацікаўленых бакоў, у тым ліку мэтавых груп і/або грамадзянскай супольнасці? Максімальны бал – 5.

1.3 Наколькі актуальная праектная прапанова для грамадзянскай супольнасці і мэтавых груп у Беларусі? Максімальны бал – 5.

**2. Раздзел «Распрацоўка праекта» (3, 4 у форме заяўкі).**
**Максімальны бал – 20.**

2.1 Ці могуць непасрэдныя вынікі праекта спрыяць чаканым зменам і ўздзеянню? Максімальны бал – 10.
2.2 Наколькі паслядоўная задума праекта? Ці з'яўляюцца прапанаваныя мерапрыемствы прыдатнымі, практычнымі і сумяшчальнымі з прадугледжанымі вынікамі і зменамі? Максімальны бал – 5.
2.3 Ці ўключае праектная прапанова адпаведныя інструменты для адсочвання прагрэсу і вынікаў праекта, а таксама механізмы карэктавання дзейнасці? Ці ёсць вартыя даверу базавыя паказчыкі, паказчыкі дасягнення мэт і крыніцы даных? Максімальны бал – 5.

**3. Раздзел «Падыход да рэалізацыі праекта» (5, 7, 8 у форме заяўкі).**
**Максімальны бал – 20.**

3.1 Ці зразумелы і выканальны план мерапрыемстваў па рэалізацыі праекта? Ці рэалістычны графік? Максімальны бал – 5.
3.2 Ці былі пры планаванні праекта дастаткова прааналізаваны і ўлічаны рызыкі? Максімальны бал – 5.
3.3 Ці адпавядаюць склад і кваліфікацыя каманды праекта запланаваным вынікам? Максімальны бал – 5.
3.4. Ці ўлічвае/закранае праект скразныя пытанні? Максімальны бал – 5.

**4. Раздзел «Фінансавыя і аперацыйныя магчымасці заяўніка(-ў)»**
**(8, 9, 10 у форме заяўкі).**
**Максімальны бал – 20.**

4.1 Ці валодаюць заяўнікі дастатковым унутраным кіраўнічым патэнцыялам (уключаючы персанал, абсталяванне і здольнасць распарадзіцца бюджэтам праекта)? Максімальны бал – 5.
4.2 Ці ёсць у заяўнікаў дастатковы ўласны вопыт кіравання праектамі? Максімальны бал – 5.
4.3 Ці ёсць у арганізацыі сістэма ўнутранага кантролю і падсправаздачнасці? Максімальны бал – 5.
4.4 Ці мае заяўнік стабільныя, дыверсіфікаваныя і дастатковыя крыніцы фінансавання? Ці ёсць у заяўніка(-аў) унутраныя крыніцы фінансавання, у тым ліку вопыт краўдфандынгу? Максімальны бал – 5.

**5. Раздзел «Устойлівасць праекта».**
**Максімальны бал – 10.**

5.1 Ці можа гэты праект мецць мультыплікатыўны эфект, у тым ліку магчымасць тыражавання, пашырэнне капіталізацыі вопыту і абмен ведамі? Ці прадугледжвае праект меры па распаўсюджванню набытых ведаў, передавой практыкі і кіраўнічых рашэнняў сярод іншых арганізацый? Максімальны бал – 5.
5.2 Ці ўстойлівыя чаканыя вынікі праекта? Максімальны бал – 5.
- *Фінансава (напрыклад, фінансаванне наступных мерапрыемстваў, крыніцы даходу для пакрыцця ўсіх будучых эксплуатацыйных і тэхнічных выдаткаў).*
- *Інстытуцыйна (ці дазволяць структуры захаваць вынікі дзеяння ў канцы праекта? «Наколькі выканаўцы будуць валодаць па сканчэнні праекта магчымасцямі кіраваць прадуктамі/дасягненнямі: валодаць, развіваць, дзяліцца?» Ці мае праект адчувальны ўплыў на экасістэму грамадзянскай супольнасці?*
- *На ўзроўні палітыкі (калі гэта магчыма): які будзе структурны ўплыў дзеяння – напрыклад, паляпшэнне заканадаўства, кодэксаў паводзін, метадаў?*

**6. Раздзел «Бюджэт і эканамічная эфектыўнасць праекта»**
**(7, бюджэтны дакумент). Максімальны бал – 15.**

6.1. Ці адпаведным чынам адлюстраваны мерапрыемствы ў бюджэце? Максімальны бал – 5.
6.2. Ці здавальняльныя суадносіны ацэначных выдаткаў і чаканых вынікаў? Максімальны бал – 5.
6.3. Наколькі даецца інфармацыя пра магчымую супадтрымку? Ці выяўлена двайное бюджэтаванне? Максімальны бал – 5.
**Максімальная агульная колькасць балаў – 100.**

## Ацэначная сетка, лот 2 і 3

**1 Раздзел «Рэлевантнасць праекта» (3.1–3.4 у форме заяўкі). Максімальны бал – 15.**

1.1 Наколькі адпавядае праектная прапанова мэтам конкурсу прапаноў і лота? Ці адпавядаюць чаканыя вынікі прыярытэтам, вызначаным у Палажэнні для заяўнікаў? Максімальны бал – 5.
1.2 Ці з’яўляецца арганізацыя «цэнтрам прыцягнення», ці з’яўляецца яна запатрабаваным пастаўшчыком паслуг або палітычным дзеячам у беларускім грамадстве ці ў канкрэтнай сферы дзейнасці? Наколькі вялікія мэтавыя групы або як многа зацікаўленых бакоў, якія атрымліваюць прамую або ўскосную карысць ад арганізацыі? Максімальны бал – 5.

1.3 Наколькі адпавядае праектная прапанова канкрэтным патрэбам і праблемам арганізацыі, яе бенефіцыяраў і зацікаўленых бакоў, у тым ліку мэтавых груп / грамадзянскай супольнасці ў Беларусі? Максімальны бал – 5.

**2. Раздзел «Распрацоўка праекта» (3.5, 3.6, 3.7, 4, 6 у форме заяўкі). Максімальны бал – 15.**

2.1 Наколькі паслядоўная задума праекта? Ці з'яўляюцца прапанаваныя мерапрыемствы прыдатнымі, практычнымі і сумяшчальнымі з прадугледжанымі вынікамі і зменамі? Максімальны бал – 5.
2.2 Ці могуць вынікі спрыяць чаканым зменам і ўздзеянню? Максімальны бал – 5.
2.3 Ці ўключае прапанова адпаведныя інструменты для адсочвання прагрэсу і вынікаў праекта, а таксама механізмы карэктавання дзейнасці? Ці ёсць вартыя даверу базавыя паказчыкі, паказчыкі дасягнення мэт і крыніцы праверкі? Максімальны бал – 5.

**3. Раздзел «Падыход да рэалізацыі праекта» (5, 6, 7, 8). Максімальны бал – 20.**

3.1 Ці зразумелы і выканальны план мерапрыемстваў па рэалізацыі праекта? Ці рэалістычны графік? Максімальны бал – 5.
3.2 Ці былі пры планаванні праекта дастаткова прааналізаваны і ўлічаны рызыкі? Максімальны бал – 5.
3.3 Ці адпавядае склад і кваліфікацыя каманды праекта запланаваным вынікам? Максімальны бал – 5.
3.4 Ці ўлічвае/закранае праект скразныя пытанні? Максімальны бал – 5.

**4. Раздзел «Фінансавыя і аперацыйныя магчымасці заяўніка(-ў)» (2, 9, 10 у форме заяўкі). Максімальны бал – 20.**

4.1 Ці валодаюць заяўнікі дастатковым унутраным кіраўнічым патэнцыялам (уключаючы персанал, абсталяванне і здольнасць распарадзіцца бюджэтам праекта)? Максімальны бал – 5.
4.2 Ці ёсць у заяўнікаў дастатковы ўласны вопыт кіравання праектамі? Максімальны бал – 5.
4.3 Ці ёсць у арганізацыі сістэма ўнутранага кантролю і падсправаздачнасці? Максімальны бал – 5.
4.4 Ці мае заяўнік стабільныя, дыверсіфікаваныя і дастатковыя крыніцы фінансавання? Ці ёсць у заяўніка(-аў) унутраныя крыніцы фінансавання, у тым ліку вопыт краўдфандынгу? Максімальны бал – 5.

**5. Раздзел «Устойлівасць праекта». Максімальны бал – 15.**

5.1 Ці можа гэты праект мець мультыплікатыўны эфект, у тым ліку магчымасць тыражавання, пашырэнне капіталізацыі вопыту і абмену ведамі? Ці прадугледжвае

праект меры па распаўсюджванню набытых ведаў, перадавой практыкі і кіраўнічых рашэнняў сярод іншых арганізацый? Максімальны бал – 5.
5.2 Ці ўстойлівыя чаканыя вынікі, змены праекта? Максімальны бал – 10.
*- Фінансава (напрыклад, фінансаванне наступных мерапрыемстваў, крыніцы даходу для пакрыцця ўсіх будучых эксплуатацыйных і тэхнічных выдаткаў).*
*- Інстытуцыйна (ці дазволяць структуры захаваць вынікі дзеяння ў канцы дзеяння? Наколькі выканаўцы будуць валодаць па сканчэнні праекта магчымасцямі кіраваць прадуктамі/дасягненнямі: мець, развіваць, дзяліцца? Ці мае праект адчувальны ўплыў на экасістэму грамадзянскай супольнасці?*
*- На ўзроўні палітыкі (калі гэта магчыма): які будзе структурны ўплыў дзеяння – напрыклад, паляпшэнне заканадаўства, кодэксаў паводзін, метадаў?*

**6. Раздзел «Бюджэт і эканамічная эфектыўнасць праекта» (Асобна бюджэт дзейнасці). Максімальны бал – 15.**

6.1 Ці адпаведным чынам адлюстраваны мерапрыемствы ў бюджэце? Максімальны бал – 5.
6.2 Ці здавальняльныя суадносіны ацэначных выдаткаў і чаканых вынікаў? Максімальны бал – 5.
6.3 Наколькі даецца інфармацыя пра магчымую супадтрымку? Ці выяўлена двайное бюджэтаванне? Максімальны бал – 5.
**Максімальная агульная колькасць балаў – 100.**

Кожная праектная прапанова ацэньваецца двума знешнімі экспертамі незалежна адзін ад аднаго. У выпадку, калі меркаванні двух экспертаў будуць істотна адрозніваецца, праект будзе накіраваны як мінімум яшчэ аднаму эксперту для дадатковай ацэнкі.

Пасля ацэнкі будзе складзена табліца з пералікам праектных прапаноў, ранжыраваных паводле балаў. Заяўкі з найбольшай колькасцю балаў будуць адбірацца папярэдне, пакуль не будзе вычарпаны даступны бюджэт для гэтага конкурсу прапаноў. Акрамя таго, па такіх жа крытэрыях будзе сфарміраваны рэзервовы спіс. Гэты спіс будзе выкарыстоўвацца, калі на працягу перыяду праграмы Belarus Beehive стане даступна больш сродкаў.

## 5.3.3. КРОК 3: ПАСЯДЖЭННЕ АДБОРАЧНАЙ КАМІСІІ

Адборачная камісія будзе складацца з мінімум 5 чальцоў з наступных груп:

1. Прадстаўнікі, прызначаныя кожнай партнёрскай арганізацыяй Belarus Beehive.
2. Давераныя і паважаныя беларускія ці міжнародныя прадстаўнікі АГС / сетак / дэмакратычных арганізацый, якія не ўдзельнічаюць у рэалізацыі праекта.

3. Знешнія эксперты, нанятыя для ацэнкі праектных прапаноў, якія будуць дзейнічаць у якасці кансультатыўнага органа без права голасу.
4. Прадстаўнікі донара будуць запрашацца для ўдзелу ў пасяджэннях Адборачнай камісіі.

Кожны чалец мае толькі адзін голас. Адборачную камісію ўзначальвае кіраўнік праграмы Belarus Beehive, які не мае права галасавання.

Адборачная камісія прымае рашэнні на падставе папярэдняй ацэнкі якасці заявак яе чальцамі (гранты ў лотах 2,3) і незалежнымі экспертамі (гранты ў лоце 1), а таксама на падставе мэт праграмы і неабходнасці расставіць прыярытэты або збалансаваць падтрымку АГС у бягучай сітуацыі.

Не пазней чым праз 45 дзён пасля заканчэння кожнага тэрміну падачы праектных прапаноў Адборачная камісія будзе збірацца (анлайн або ў гібрыдным фармаце) для абмеркавання ацэненых праектаў і прыняцця канчатковага рашэння. Будзе падрыхтаваны ўнутраны Пратакол з пералікам зацверджаных, адхіленых ці ўключаных у рэзервовы спіс праектаў.

Адборачная камісія пакідае за сабой права ўмоўна зацвердзіць праектную прапанову з рэкамендацыямі па карэктаванні прапаноў і/ці бюджэту. Рэкамендацыі могуць прымяняцца толькі ў тым выпадку, калі гэта не ставіць пад сумнеў само прысуджэнне гранта. Рашэнні пра выдачу грантаў у надзвычайных сітуацыях, якія патрабуюць хуткага рэагавання, прымаюцца як мага хутчэй.

Пасля разгляду адборачнай камісіяй, у выпадку, калі заяўка будзе ацэнена як патэнцыйна добрая, але з неабходнасцю паляпшэння, заяўніку прапануецца дапамога кансультанта/ментара або грант-менеджара для дапрацоўкі заяўкі ў адпаведнасці з патрабаваннямі конкурсу і рэкамендацыямі Адборачнай камісіі. У гэтым выпадку заяўка можа быць:

- Перапададзена падчас будучага конкурсу.

- Пададзена на разгляд іншым донарам (са згоды заяўніка).

У выпадку атрымання рэкамендацый Адборачнай камісіі па карэктаванні грант-менеджары разам з заяўнікамі адкарэктуюць заяўкі ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Адборачнай камісіі.

Час на афармленне неабходных дакументаў павінен займаць не больш за месяц.

## 5.3.4. КРОК 4: ПРАВЕРКА ПРЫМАЛЬНАСЦІ ЗАЯЎНІКАЎ

Праверка прымальнасці будзе праводзіцца на аснове пацвярджальных дакументаў, запытаных бенефіцыярам праекта. Гэта будзе выканана толькі для праектных прапаноў, якія былі папярэдне адабраны ў адпаведнасці з баламі і ў межах даступнага бюджэту для гэтага конкурсу прапаноў.

Дэкларацыя вядучага заяўніка будзе зверана з пацвярджальнымі дакументамі, дадзенымі заяўнікам(-і). Любы адсутны пацвярджальны дакумент або любая неадпаведнасць паміж дэкларацыяй заяўніка і пацвярджальнымі дакументамі можа прывесці да адмовы ў праектнай прапанове толькі на гэтай падставе.

Прымальнасць заяўнікаў будзе правярацца ў адпаведнасці з крытэрыямі, выкладзенымі ў раздзеле 2.1.1.

Любая адхіленая праектная прапанова будзе заменена наступнай найлепшай праектнай прапановай у рэзервовым спісе, якая ўваходзіць у даступны бюджэт для гэтага конкурсу прапаноў.

### 5.3.5. КРОК 5: ПАДАЧА ДАКУМЕНТАЎ ДЛЯ ПАПЯРЭДНЕ АДАБРАНЫХ ЗАЯВАК

Заяўнік, чыя заяўка была папярэдне адабрана або ўнесена ў рэзервовы спіс, будзе праінфармаваны ў пісьмовай форме супрацоўнікамі праграмы Belarus Beehive.

Заяўніку будзе прапанавана падаць наступныя дакументы:

1. Скан пасведчання аб рэгістрацыі арганізацыі (для юрыдычных асоб) і скан статута.
2. Кантактныя дадзеныя арганізацыі (адрас, тэлефон, электронная пошта – на англійскай мове).
3. Банкаўскія рэквізіты арганізацыі для атрымання грашовых сродкаў у еўра (імя ўладальніка рахунку, назва банка, адрас банка, IBAN, SWIFT – усё лацінкай).
4. Пратакол пасяджэння кіраўнічага органа аб прызначэнні:
*а. Кіраўніка праекта.*
*б. Упаўнаважанага прадстаўніка арганізацыі для падпісання кантракта з адказным партнёрам Belarus Beehive.*
5. Кантактная інфармацыя (адрас, тэлефон, электронная пошта кіраўніка і прадстаўніка арганізацыі: поўнае імя (кірыліцай і лацінкай, як у пашпарце), хатні адрас).

*Калі пералічаныя дакументы не будуць дадзены да заканчэння тэрміну, указанага ў запыце, накіраваным заяўніку супрацоўнікам праграмы Belarus Beehive, праектная прапанова можа быць адхілена.*

Любая адхіленая прапанова будзе заменена наступнай найлепшай у рэзервовым спісе, якая ўваходзіць у даступны бюджэт для гэтага конкурсу прапаноў.

Пасля праверкі пацвярджальных дакументаў Адборачная камісія прыме канчатковае рашэнне.

### 5.3.6. КРОК 6: ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРА РАШЭННЕ

**Змест паведамлення**

Заяўнікі будуць пісьмова праінфармаваны наконт рашэння адносна іх праектнай прапановы і, у выпадку адмовы, наконт прычын адмоўнага рашэння.

Заяўнік, які лічыць, што ён пацярпеў з-за памылкі або парушэння ў працэсе адбору, можа падаць скаргу, даслаўшы электронны ліст на адрас complaints@belarusbeehive.eu.

### ТЭРМІНЫ БЯГУЧАГА АДКРЫТАГА КОНКУРСУ

0. Абвестка пра конкурс: 25 сакавіка 2024 г.

1. Апошні тэрмін звароту па тлумачэнні ад каманды Belarus Beehive:
*24 красавіка 2024 г.*

2. Апошні тэрмін выдачы ўдакладненняў і адказаў на пытанні камандай Belarus Beehive: *28 красавіка 2024 г.*

Апошні тэрмін падачы заявак лотаў 1, 2, 3: *1 траўня 2024 г., 23:59 (час паводле Мінска, Беларусь – UTC/GMT +3:00).*

3. Інфармацыя для заяўнікаў пра адміністрацыйныя праверкі (Крок 1): пастаянна.

4. Інфармацыя для заяўнікаў пра ацэнку заявак (Крок 5) і запыт пацвярджальных дакументаў: у межах 14 дзён з даты атрымання заяўкі.

5. Паведамленне пра вынікі разгляду (Крок 6): *7 чэрвеня 2024 г.*

6. Падпісанне кантрактаў: *чэрвень – ліпень 2024 г.*

*Гэты арыенціровачны графік, ён можа быць абноўлены праграмай Belarus Beehive.*
*У такіх выпадках абноўлены расклад будзе апублікаваны на сайце праекта www.belarusbeehive.eu.*

## 6. ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ ДАЛЕЙШЫХ КРОКАЎ ПАСЛЯ ПРЫНЯЦЦЯ РАШЭННЯ ПРА ВЫЛУЧЭННЕ ГРАНТА

Пасля прыняцця рашэння пра вылучэнне гранта атрымальніку будзе прапанаваны кантракт на аснове стандартнага кантракта аб гранце. Падпісваючы форму праектнай прапановы (у вэб-аплікацыі) да гэтага Палажэння, заяўнікі згаджаюцца, што ў выпадку атрымання гранта прымуць умовы стандартнага кантракта на грант.

Колькасць траншаў апісваецца ў падпісаным грантавым пагадненні ў залежнасці ад працягласці праекта і сумы фінансавання.

Кантракты на аснове вынікаў *(Output Based Contracts)* могуць прымяняцца пасля іх распрацоўкі паводле асобнага ўзгаднення з донарам.

Будуць арганізаваны ўступныя сустрэчы з атрымальнікамі грантаў для тлумачэння патрабаванняў да рэалізацыі і справаздачнасці, узгаднення каналаў сувязі і г. д.

## 7. СПІС ДАДАТКАЎ (ДАСЯЖНЫЯ Ў ВЭБ-АПЛІКАЦЫІ)

**Дакументы, якія трэба запоўніць:**

**Дадатак A: Дэкларацыя заяўніка**

**Дадатак B: Мандат сузаяўніка (калі ёсць)**

**Дадатак C: Бюджэт дзейнасці (у фармаце Excel)**

**Увага!**

Для лотаў 2 і 3 заяўнікі, каб быць кваліфікаванымі для падачы заяўкі, павінны прыкласці дакумент з ацэнкай арганізацыйнага патэнцыялу і план арганізацыйнага развіцця, які распрацаваны з дапамогай знешняга кансультанта на працягу апошніх 12 месяцаў да заканчэння тэрміну прыёму заявак.

***Таксама заяўнікі могуць звязацца з экспертамі Belarus Beehive для дапамогі ў стварэнні гэтых дакументаў праз электронную пошту consulting.beehive@proton.me.***